одноименности (далее – СКО) показывает, что направленность тенденции к концентрации на определенных исторических этапах в городе и селе аналогична, основное различие же кроется в том, что, во-первых, снижение концентрации в селе отмечено на десятилетие раньше (в 1974 г., г. Витебск – с 1984 г.), а во-вторых, изменяющиеся показатели СКО в мужской и женской частях антропонимной системы Витебского района в конце XX в. «зеркально» повторяют друг друга. Так, в 1974 г. СКО мужского именника в Витебском районе равен **8** единицам, женского – **7**, в 1984 г. соответственно **7 / 7**, 1994 – **4 / 4**.

Как известно, характер именослова любого региона в значительной степени определяется десяткой самых употребительных имен, обслуживающей обычно более половины всех имяносителей. Статистика обнаруживает полное совпадение в городе и селе абсолютных лидеров мужского антропонимного фонда. Зачастую конкретное имя, располагающееся на периферии сельского антропонимикона, под влиянием его повышенной популярности в городе стремительно выдвигается в фавориты, например, *Александр* (1941-44 гг. г. Витебск – **3-й** ранг, Витебский район – **7-й**; 1954 г. г. Витебск, Витебский район –**1-й** ранг), *Сергей* (1954-й г. – **4-й** / **10-й**; 1964 г. г. Витебск, Витебский район – **1-й**), *Андрей* (1964 г. **7-й** ранг / не входило в первую десятку; 1974 г. – **3-й** / **2-й**) и др. В Витебском районе тенденцию к более широкому распространению обнаруживают антропонимы *Иван* (1941-44 гг. – **3-й** ранг, 1964 и 1974 гг. – **9-й**; 1994 г. – **8-й**; г. Витебск 1941-44 гг. – **10-й** ранг), *Василий* (1941 – 1974 гг. – в составе 2-й пятерки; в г. Витебске не входило в число десяти самых частотных имен), *Николай* (в составе десятки на протяжении 40 – 90-х гг.; г. Витебск – только в 40 – 50-е гг.), *Виктор* (в Витебске отличается повышенной популярностью в 40 – 60-х гг., а в Витебском районе – вплоть до 1994 г., выходя за пределы первой десятки лишь в 80-х гг.) и др.

Сопоставление наборов женских десяток городского и сельского именников показывает, что на разных этапах в селе повышенной употребительностью отличались имена *Вера* (Витебский район 1944 г. – **5-й** ранг, 1954 – 1974 гг. – **9-й**; г. Витебск 1941-44 гг.– **8-й**), *Любовь* (Витебский район 1944 – 1974 гг. – входит во вторую пятерку; г. Витебск 1941 – 44 гг. – **9-й** ранг), *Надежда* (Витебский район 1944 – 1954 гг. – **4-й** ранг, 1974 – 1984 – **9-й**; г. Витебск 1941– 44 гг. – **6-й**, 1954 г. – **10-й**), *Раиса* (1944 – 1954 гг. – **6-й** / не входило) и др. Наибольшие различия в корпусе самых частотных антропонимов г. Витебска и Витебского района отмечены в 40-е и 90-е гг. XX в., когда в состав женской десятки в селе входило соответственно **23** / **19** антропонимных единиц, а применительно к мужскому именослову на срезе 1994 г. следует говорить о девятке (**21** единица), закрывающей список популярных именований.

Таким образом, при сходстве тенденций функционирования городской и сельский именословы отличаются различной их реализацией. Именник деревни вбирает в себя всё то, что становится характерным по мере эволюции для городской среды, не утрачивая при этом своей специфики, проявляющейся как на уровне его статистической организации (незначительная по сравнению с городом диспропорция количественного состава и показателей концентрации женской и мужской подсистем именника и др.), так и в темпах динамики.

## ВІЦЕБШЧЫНА Ў МЕМУАРАХ: НЕКАЛЬКІ СЛОЎ ПРА “ДЫЯРЫЎШ” Я.А. ХРАПАВІЦКАГА

***В.У. Таранеўскі***

Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі падае звесткі толькі пра аднаго Храпавіцкага-Ігната Яўстахавіча (31.7.18XVII – 25.12.1893), беларускага фалькларыста і грамадскага дзеяча, але зусім не ўпамінае віцебскага ваяводу, мемуарыста Я.А.Храпавіцкага і яго нашчадкаў, хаця сярод іх былі знаныя людзі: кашталяны, старасты, войскія, каралеўскія сакратары. Некаторыя з іх пасля апошняга падзелу Рэчы Паспалітай, як, напрыклад, Аляксандр Васільевіч Храпавіцкі (XVII49 – 1801), статс-сакратар імператрыцы Кацярыны II, верна служылі Расіі.

“Дыярыўш” віцебскага ваяводы без агаворкі можна назваць творам усяго яго жыцця і “каралеўскім” як па аб’ёме, так і па насычанасці інфармацыяй, якая датычыцца асобы самога аўтара і тагачаснага грамадства. Храпавіцкі, урэшце, свой “Дыярыўш” называе “прыватным”: “Дыярыўш прыватны, год 1660. Пачаў я, выехаўшы перад Масквою з Андрыянак, у вёсцы Клопатава, у зямлі Драгічынскай, сапраўды ў клопатах”. Або “Дыярыўш прыватны, год 1663, які пачаў я яшчэ ў выгнанні, у дарозе, едучы ў Пуні, у Трокскае ваяводства. Дай, Божа, закончыць яго ў парогах Айчыны”. Ці “Дыярыўш прыватны, год 1664, які, дай, Божа, каб быў шчаслівей за мінулы. Пачаў я ў дарозе, едучы на маскоўскую камісію” (2). Гэтыя загалоўкі, арыгінальнага паходжання, падказваюць нам, што Я.Храпавіцкі вазіў з сабой запісную кніжку, у якой рэгулярна рабіў запісы пра



Репозиторий ВГУ

“Otia publica” і “ Otia domestica”, якія аб’ядноўваў прыналежнасцю да іх сваім “я”. Менавіта сам мемуарыст – эпіцэнтр падзеі, ён герой, і ён вядзе апавяданне пра яе. Усё гэта і сведчыць пра свядомую ўстаноўку Я.А.Храпавіцкага найперш пісаць пра сябе і пра тое, што дзеялася поруч з самім, а не недзе аддалёк ад яго. У гэтым сэнсе суб’ектывізм мемуарыста выразна падкрэслены, відавочны, як падсветка асобнай індывідуальнасці, асобы, чалавека, грамадзяніна.

Аскар Уальд калісьці сказаў: “Вернасць і пастаянства – гэта летаргія звычкі або адсутнасць уяўлення”. На працягу 29 год Я.А.Храпавіцкі з зайздросным пастаянствам вёў дзённік сваіх прыватных спраў і спраў Рэчы Паспалітай. Справядлівымі тут бачацца нам словы Уальда: прывычка і абавязак кіравалі мемуарыстам, але абвінавацiць яго ў адсутнасці фантазіі мы не можам. Пісаў ён свой дзённік без прэтэнзіі на літаратурнасць і выдумку, такой была традыцыя напісання падобных рэчаў, якая патрабавала рэальных фактаў у іх рэальным ходзе. Факты маглі быць розныя: ваенныя, палітычныя, касцёльныя, сямейныя, прыродныя і нават нябесныя. Апошніх, скажам, у Я.А.Храпавіцкага мала, хоць і быў ён блізкім да касцёла, але не фанатычна блізкім, у адносінах з ім заўсёды заставаўся ўраўнаважаным і ў межах таго, чаго патрабавалі час і этыка шляхціца высокага стану. Еўрапейская адукаванасць, побыт у Францыі і Італіі, якія ў XVII ст. ужо сцвердзілі рэнесансавыя ідэі, вызначылі свае адносіны да Бога, дапамаглі Храпавіцкаму займець свой погляд на касцёл, стаць чалавекам рацыянальным і прагматычным. Акрамя таго ён быў дзяржаўным чалавекам, пастаянна занятым на сеймах, у камісіях, трыбуналах, двойчы маршалкаваў у Пасольскім Коле, усё гэта таксама вымагала ад яго больш розуму і разважлівасці, чым эмоцыяў і фантазіі. Грамадзянская пазіцыя Я.Храпавіцкага, прыхільніка каралеўскай улады, выразней праяўляецца ў “Otia publica” і асабліва, калі ён піша пра багатае на палітычныя і мілітарныя падзеі жыццё Рэчы Паспалітай другой палавіны XVII ст., у якіх прымаў удзел ці пра якія яму паведамлялі шматлікія рэзідэнты. Аб’ём “Дыярыўша” не дазваляе нам ісці ўслед за аўтарам, каб падмацаваць вышэйсказанае прыкладамі. Тым болей, што Я.Храпавіцкі ўпісваў у яго ўсе свае справы, найперш падарожжы, удзел у шматлікіх з’ездах, візіты гасцей, атрыманне і адсылку карэспандэнцыі, дамовы з людзьмі аб працы і службе, выплату ім грошай. Акрамя гэтага, мемуарыст штодзённа натаваў стан надвор’я і некаторыя важнейшыя выпадкі: смерць выбітных асобаў, паездкі караля і каралевы і г.д. Таму, несумненна, “Дыярыўш” Я.А.Храпавіцкага шмат у чым падобны на канцылярскія Дыярыўшы, шырока распаўсюджаныя ў Рэчы Паспалітай і Вялікім княстве Літоўскім у другой палавіне XVI-XVII стст. Аналагічныя былі і ў Масковіі, у прыватнасці, дзённік спраў цара Аляксея Міхайлавіча – “Приказ Тайных Дел” (2). Самым старшым канцылярскім “Дыярыўшам” у ВКЛ з’яўляецца “Дыярыўш” канцылярыі Крыштафа Радзівіла, які захаваўся да нашага часу толькі ў фрагменце. А самым вядомым Дыярыўшам канцылярскага тыпу, які вёўся асабіста Радзівілам, з’яўляецца “Дыярыўш” італьянскага падарожжа біскупа Ежы Радзівіла, які ахоплівае час з 11 кастрычніка па 7 снежня 1575 года. Праўда, калі мы гаворым пра канцылярызм “Дыярыўша” Я.А.Храпавіцкага, то маем на ўвазе яго абсалютную рэгулярнасць, бо за ўвесь час запісаў прапусціў ён хіба што тры дні. Ніхто нікога не абавязваў выконваць нудныя абавязкі пісара, не бачым мы тут і душэўнага парыву. Запісванне было неабходным для таго, каб трымаць руку на пульсе часу, каб быць кампетэнтным у палітычных і ваенных справах дзяржавы. Т.Васілеўскі, сучасны выдавец “Дыярыўша” Я.Храпавіцкага, справядліва адзначыў, што спосаб правядзення запісаў Храпавіцкім даў яму магчымасць выразна падаць тагачасную “палітычную фактаграфію”, “польска-беларускую ментальнасць” і “вобраз паўночна-усходняй Польшчы”, на тэрыторыі якой мемуарыст сапраўды правёў амаль усё жыццё. Што датычыцца рэфлексіі і каментарыяў Я.А.Храпавіцкага, то яны слабыя і рэдкія. Але штодзённыя запісы ў яго затое педантычныя і дакладныя, у іх мы лёгка вычытваем абставіны рэальнасці, спосаб жыцця аўтара – героя “Дыярыўша”, яго ідэалогію, мараль, адным словам, ментальнасць канкрэтнага чалавека, прадстаўніка вышэйшых шляхецкіх колаў Рэчы Паспалітай XVII ст.

І гісторыю свайго прыватнага лёсу пераказаў ён ў форме штодзённых запісаў, і у момант гэтага пераказу нават яго індывідуальны талент аўтара-апавядальніка мог быць бездапаможным перад тысячамі фактаў, якія патрэбна было ўмясціць у канкрэтную часавую прастору, падзеленую на дні. Такі спосаб запісаў абмяжоўваў само апавядальніцтва мемуарыста, не дазваляў яму стаць пісьменнікам. Аднак XVII ст. – гэта час секулярызацыі дыярыўшавай формы, час адыходу ад дыярыўшовага канона, пра гэта сведчаць творы жаўнераў, якія бралі ўдзел у войнах, што Рэч Паспалітая вяла ў Еўропе, асабліва на яе ўсходніх тэрыторыях, з Маскоўскім княствам. На першы план тут, несумненна, выходзяць “Пасольства і кароткае апісанне перамоваў і трактатаў з Масквою ў годзе 1601 праз 28 тыдняў” Г.Пельгжымоўскага, “Дыярыўш Я.П.Сапегі”, “Пачатак і прагрэс вайны маскоўскай” Станіслава Жулкеўскага, “Дыярыўш” С.Маскевіча і “Запіскі мае і дыярыўш…” Я.У.Пачобута-Адляніцкага.

Літаратура

1. Дневальные записки Приказа Тайных Дел 7165-7183 (1657-1678). Выд. С.Н.Белокуров. «Чтения Императорского Общества Истории и Древностей», 1908, книга 1, С.1-224, книга 2, С.225-346.
2. Chrapowicki I.A. Diariusz. Część pierwszo. Warszawa, 1978.